вёскі больш абвострана і трагічна, паказваючы драму непазбежнасці поўнага вынішчэння вёскі. Паглыбленне маральнай праблематыкі пісьменнік паказвае праз паводзіны людзей у складанай сітуацыі: хто застаецца чалавекам, а хто ператвараецца ў "Пятруху", чалавека, які дзеля атрымання грошай, спальвае свой дом, кінуўшы маці на суседзяў. У кампазіцыйнай структуры аповесці В. Распуціна і рамана І. Пташнікава таксама назіраецца тыпалагічнае падабенства – важную функцыю выконваюць дыялогі, унутраныя маналогі і ўспаміны герояў.

Закранаючы праблемы ўзаемасувязі пакаленняў, чалавечага сумлення, вечнага пошуку сэнсу жыцця, абодва аўтары ўжываюць падобныя нарратыўныя прыёмы: мастацка-сэнсавае вылучэнне ключавых момантаў, эпізодаў, прыём рэтраспектывы, трапныя псіхалагічныя акцэнты на дэталях, глыбокая змястоўнасць сімвалічнай вобразнасці (у рамане І. Пташнікава "Алімпіяда"); ужыванне прыёмаў актывацыі чытацкай увагі, атаясамліванне наратара, пісьменніка і героя, што аказвае ўплыў на фарміраванне наратыўных інтанацый, на спалучэнне ў творы знешняй падзейнасці з унутранай (у аповесці В. Распуціна "Развітанне з Мацёрай").

Вобраз-канцэпт жанчыны ў беларускага і рускага пісьменнікаў выразна актуалізаваны пры ўвасабленні праблем нацыянальнага самаўсведамлення і грамадскай адказнасці сучасніка. Вобразы гераінь абодвух пісьменнікаў надзелены архетыпавымі рысамі: ахвярнасцю, зычлівасцю і бязмежнай любоўю да дзяцей і роднага краю, якія ў крытычнай сітуацыі ўзбуйняюцца да рашучасці, адвагі, бескампраміснай сумленнасці і самаахвярнасці.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Пташікаў, І. Збор твораў : у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – Т. 4 : Раман. – 575 с.

2. Распутин, В. Последний срок. Прощание с Матёрой: Повести. Рассказ : для ст. шк. возраста / В. Распутин. – Минск : Юнацтва, 1990. – 383 с.

3. Сапа, А. Женские образы в творчестве В. Распутина / А. В. Сапа. – М. : Аналит. исслед., 2017. – 160 с.

4. Юнг, К. Душа и миф: шесть архетипов / К. Юнг. – ЗАО «Совершенство» – «Port Royal», 1997. – 384 с.

**Л. М. Грыцук**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

## ВЕЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ Ў ЭЛЕГІЧНЫХ ТВОРАХ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

Пасля вайны ў творчасці А. Куляшова адбываецца рэзкая пераацэнка каштоўнасцей, вынікам чаго становяцца адзнакі палітычна завостранага і медытатыўнага пісьма. Гэтыя адзнакі выразна выявіліся ў "Новай кнізе" (1963). Кніга складаецца з пяці раздзелаў, якія нельга памяняць месцамі, бо парушыцца не толькі кампазіцыя, але і стройная, прадуманая эвалюцыя філасофска значных

думак. Першыя тры раздзелы – толькі папярэдняя спроба раскрыцця вечных тэм, пошук такога спосабу адлюстравання рэчаіснасці, калі не ўсё ляжыць на паверхні, а значная частка застаецца ў глыбіні, у падтэксце. Нібы падсумоўваючы ўжо тады назіранні і над сваёй уласнай паэзіяй, мастак гаварыў, што "творы на так званыя «вечныя» тэмы... недарэчна лічыць здачай баявых пазіцый, як гэта іншы раз спрабуюць рабіць некаторыя" [3, с. 423]. Выказванне характэрнае. Пройдзе час, і заключаныя ў ім думкі разгорнуцца ў філасофскія медытацыі пра вечныя праблемы чалавечага жыцця, пра агульначалавечае.

У першых трох раздзелах "Новай кнігі" пакуль што пераважае адычная ўрачыста-радасная інтанацыя, адчуваецца, што паэт стараецца максімальна "выціснуць" усё магчымае з публіцыстычных жанраў.

Пяты раздзел "Новай кнігі" адкрываецца і заканчваецца элегічнымі творамі, утвараючы сэнсавую, кампазіцыйную, фармальную цэласнасць. Тут адбылося "сцяжэнне" адзнак розных паэтычных утварэнняў у адным жанры – філасофскай, медытатыўнай элегіі. Так паэт ішоў не да жанравай разнастайнасці, а да жанравай строгасці і пэўнасці ў 60–70-я гг. У куляшоўскіх элегіях як бы падведзены падрахунак жыцця ўсеагульнага, пераламілася нявечнае ў вечным і, наадварот, сутыкнуліся чалавек і прырода ў сваіх вытоках і магчымых працягах, Святло адбілася ў Цемры, балючае ў радасным. Свет паўстае ў куляшоўскіх элегіях цэласным і гарманічным, хоць і з трагедыйнай падсветкай. Чалавек аказваецца ў самым цэнтры яго, становіцца рэгуліроўшчыкам жыццёвай каруселі не толькі ў планетарным, але і ў сусветным маштабе:

Завея лісцяў у сняжынак пух
Перацвітае пад маім наглядам, –
Як быццам я камандую парадам,
Спатканнем дзвюх варожых завірух,
Змаганнем снегападу з лістападам.
Як быццам я ўладар дарог і рэк,
Рэгуліроўшчык каруселі гэтай,
Як быццам не праносіў над планетай
Мяне лістком, сняжынкаю, ракетай
Праз атмасферны ціск суровы век [2, с. 78].

Гэтым вершам заканчваецца "Новая кніга". У ім многія філасофскія назіранні і вывады сцягваюцца, завязваюцца ў моцны вузел. Ні ў адной з пазнейшых элегій не заключана такая глыбінная палеміка з папярэднікамі наконт магчымасцей чалавека як кіраўніка і арганізатара жыцця, яго смелага і ўмелага рэгуліроўшчыка. У элегіі А. Куляшова чалавекператварае свет па свайму разуменню, "камандуе парадам", нібы забыўшыся, які боль прынёс і па-ранейшаму прыносіць людзям час, на хуткаплыннасць жыцця. Чалавек – у цэнтры створанага Куляшовым свету. Ён усясільны. Як і ў вядомай (дарэчы, элегічнай па танальнасці) кнізе Э. Межэлайціса "Чалавек".

Элегія А. Куляшова пра жыццё і смерць – яркі ўзор медытатыўна-выяўленчай лірыкі, лагічна пераканальнага, ледзь не тэзісуальнага пісьма: Ператварацца буду зноў і зноў // З ідэі ў плоць, з жыцця ў жыццё другое... //

Жыву, і пачуццё ў мяне такое, // Як быццам мне не пяцьдзесят гадоў, // А пяць стагоддзяў – самае малое [2, с. 74]. Беларуская паэзія і да А. Куляшова паказвала дыялектычную зменлівасць жыцця, старалася зразумець, якое месца займае чалавек у сусвеце, спрачалася па пытаннях вечнага і часовага, зменлівага і нязменнага. Дастаткова прыгадаць верш Я. Купалы з характэрным загалоўкам "Кругазварот", цыкл вершаў М. Багдановіча "Каханне і смерць". Аднак ніхто з паэтаў да А. Куляшова не ставіў праблему дыялектычнай зменлівасці жыцця ў цэнтр творчасці, не даследаваў яе цэласна, на глыбокай навуковай аснове і па-мастацку вобразна, пераканальна, эмацыянальна.

Наватарства А. Куляшова, якога цікавіць праблема абуджэння чалавечага ў чалавеку, заключаецца ў тым, што ён ідзе далей за сваіх папярэднікаў, заглядвае ў больш даўнія перыяды гісторыі. Калі звярнуцца да філасофска-навуковага плана, то тут паўстае праблема "акіян-чалавек" у такіх элегіях, як "Сышлося неба з акіянам блізка...", "Не злуйся, акіян, калі патраплю...". У іх назіраецца паважнае, міфалагічна-язычніцкае шанаванне акіянскіх глыбіняў, акіянскай шыры і моцы, акіяна – прарадзімы ўсяго жывога на зямлі. Выхаванец акіяна, вынік генетычных працэсаў, што адбываліся ў глыбінях яго вод, – такі чалавек у першым з названых твораў. Ён як бы пераўвасобіўся з сябе цяперашняга ў сябе мінулага, растварыўся ў часе і гойдаецца на акіянскіх хвалях: Сышлося неба з акіянам блізка: // На горы хваль кладзецца хмар туман. // Мне хораша! Не грозны акіян // Мяне гайдае, а вякоў калыска [2, с. 58].

Сучасны чалавек увасобіўся ў дачалавека, у істоту, з якой пачыналася паходжанне розуму на зямлі. І гэты прапрачалавек імкнецца зразумець сябе – маленькую, пакуль яшчэ маўклівую, але жывую часцінку прыроды:

Я слухаю – ужо не чалавек –
З маўклівым, невыразным захапленнем
Да болю блізкі шум вады змяшчэннем
У міліярды міліярдаў рэк [2, с. 58].

Нетаропка разгортваецца ў вершы і апавяданне, што таксама ў дадзенай канкрэтнай сітуацыі мае значэнне: ствараецца ўражанне, што фразы чапляюцца адна за адну. Эфект запаволенасці тэмпу апавядання ствараецца і парушэннем парадку слоў, і ўскладненнем сказаў, тым, што нярэдка асобныя вершы з'яўляюцца сінтаксічнымі цэласнымі адзінкамі-перыядамі.

Элегія "Не злуйся, акіян, калі патраплю..." – твор пра развітанне за акіянам, хоць і сумнае, але поўнае ўсведамленне сваёй адказнасці перад ім, вернасці чалавека малой радзіме, калысцы. Тут акіян – не мяцежны праціўнік, не антыпод роднай Бесядзі, а радасны, блізкі і шчыры бацька, крыху расчулены і сентыментальны. І суша ў вершы аказваецца не антыподам акіяна, а блізкай яму стыхіяй:

Яшчэ не хутка пругкаю хадою
Стамлюся вымяраць я свет жывы
Тваіх глыбінь, схаваных пад вадою,
Тваіх далін працяг берагавы [2, с. 61].

І заканчваецца верш передачай адчування істоты, якая ўвабрала ў сябе адзнакі марской стыхіі і не хоча іх расчараваць:

Са схаваў патаемных, як з ракушкі,
Не выпушчу я хваляў штармавых,
Каб слухалі іх нівы, кветкі, птушкі,
Прыпаўшы вухам да грудзей маіх [2, с. 61].

Перш за ўсё трэба адзначыць важны вывад аўтара пра вяртанне чалавека да стыхіі, вяртанне ў новай якасці – рэгуліроўшчыка жыццёвай каруселі, арганізатара жыцця ў сусветным маштабе. Не менш важны яшчэ адзін вывад паэта – пра тое, што ўсё злілося ў чалавеку – гэтай "жывой кропельцы", "трэцім свеце", у маленькай часцінцы, якая "неба і зямлю ў сабе змяшчае".

Пра "Новую кнігу" А. Куляшова як фенаменальную з'яву яшчэ далёка не ўсё сказалі і напісалі. Яна нарадзілася на хвалі агульнага – сацыяльнага, маральнага, інтэлектуальнага – уздыму жыцця грамадства, на хвалі веры ў магчымасць дасягнення велічных рубяжоў, пастаўленых перад чалавецтвам, гісторыяй ды і самім месцам яго сярод усяго жывога на зямлі, ролю "мыслячай істоты". Медытатыўнасць стала душой паэзіі А. Куляшова і ў 70-я гг. Паэт замацоўвае ранейшыя набыткі цэласнага, маштабнага пазнання свету ў перыяд страт, занядбання той веры ў магчымасці чалавецтва, пра якую было згадана вышэй. Пафас і настрой твораў канца 60-х – пачатку 70-х гг. у многіх супадае з пафасам твораў, што ўвайшлі ў "Новую кнігу", – ён элегічны, сумны, трагедыйны, далёкі ад кан'юнктурнага аптымізму і неабгрунтаванай гераізацыі. Аднак ёсць і істотнае адрозненне – новыя вершы свабодныя ў фармальных адносінах, у іх неадчувальная зададзенасць менавіта элегічнай жанравасці. Паэтычны свет у новых вершах Аркадзя Куляшова як бы загаварыў на розных мовах. Паэт даў магчымасць выгаварыцца не толькі сабе самому, але і іншым. Вядома, ён выказаў і асабістыя адносіны да маналогаў сваіх герояў, нібы зліўся з імі, але і не стаў над імі ў позу, не дыктуе ім сваю волю.

У зборніку "Хуткасць" ёсць вершы, вытрыманыя ў традыцыйнай, уласцівай "Новай кнізе", элегічнай інтанацыі. У іх ("Адзіны серп на сённяшнім жніве", "Хуткасць", "Пра славу", "Парада сабе самому", "Зайздрошчу я мастам, не іх канструктарам...", "Запісная кніжка", "Мой Новы год") з першага і да апошняга радка пульсуе напружаная аналітычная думка. Яны – пра сябе самога і ўвесь свет. Пра вечнае. Амаль усе новыя вершы А. Куляшова так ці інакш датычацца тэмы паэта і паэзіі. Усе яны адначасова пра вынікі жыцця і працы, пра ацэнку набыткаў мастацтва людзьмі, пра тое, што

Лепш падаць і ўставаць з нялёгкаю ношаю,
Чым злёгку папіхаць яе рукой [2, с. 29].

А. Куляшоў праз адну з цэнтральных тэм паэзіі раскрывае і лабараторыю працы мастака, і яго ўзаемаадносіны з эпохай, часам, грамадствам, паказвае інтэлектуальны свет стваральніка прыгожага. Наватарства паэта ў апошніх па часе элегіях заключаецца ў тым, што ён, як і М. Танк, А. Твардоўскі апошніх гадоў, зрабіў аб'ектам мастацкага даследавання літаратурна-творчы працэс, увёў

чытача ў глыбіні творчай лабараторыі мастака (вершы "Пра славу", "Слова пра вала", "Парада сабе самому", "Пастух"). У іх раскрываецца складанасць і драматызм творчага працэсу, сцвярджаецца яго першароднасць, сувязь з рэальным зямным жыццём і не менш рэальным і зямным натхненнем ("Пастух"), неаднамернасць вынікаў гэтага працэсу. У вершы "Слова пра вала" аспрэчваецца вядомы крылаты выраз пра няўдзячнасць чалавечай працы ў пэўных умовах – насуперак традыцыйнай формуле аўтар выводзіць сваю, паводле якой чалавек-стваральнік чорным валам адчувае сябе не за працай, а калі бяздзейнічае:

Хоць я працую ноччу, днём
І адвячоркам зорным,
Ды не магу сябе валом
Назваць, тым болей – чорным.
А вось адвыкнуць ад стала
Пяро, папера, слова –
То я падобны на вала
Раблюся паступова [2, с. 10].

А. Куляшоў паставіў перад сабой звышзадачу: пад наслаеннем часовага ўбачыць вечнае, раскрыць духоўны свет чалавека, супрацьпаставіўшы яго бездухоўнасці антычалавека. Слушна зазначыў С. Андраюк: "Уважліва разглядаючы зблізку сучасны літаратурны працэс, які пачаўся ў сярэдзіне 50-х гг., і адпаведна праблему паказу чалавека, праблему характару, можна заўважыць даволі прыкметную трансфармацыю. Літаратура спачатку паказвала чалавека ў самых непасрэдных, бліжэйшых сувязях, дзе для характарыстыкі істотнае значэнне меў рэальны жывы факт. Пазней чалавек даследаваўся і асэнсоўваўся ў шырокіх гістарычных сувязях, у кантэксце сацыяльнай гісторыі народа. Сёння назіраецца ўсё большае пранікненне ў духоўны свет чалавека, грамадства, народа. Найперш і пераважна чалавека" [1, с. 124].

З поўным правам можна сцвярджаць, што своеасаблівасць куляшоўскага наватарства крыецца перш за ўсё ў паглыбленні зместу, сэнсу, у павароце да таго, без чаго сапраўднае мастацтва не можа жыць, – вызначальных праблем чалавечага існавання. Але паэт выступае не меншым наватарам і ў тым выпадку, калі бярэ за аснову традыцыйны жанр – у дадзеным выпадку элегія – і так трансфармуе яго ў верш-медытацыю, верш-разважанне, верш – філасофскі маналог. Старажытная жалобная песня яго намаганнямі ператвараецца ў твор, у якім сінтэзуюцца і думка, і пачуццё, і захапленне, а кожнае слова ператвараецца ў згустак мыслярскай і пачуццёвай энергіі, агульнае і канкрэтнае ўзаемадапаўняюцца, свабодна пераходзяць адно ў другое. А. Куляшоў паставіў элегію на такую вышыню, на якой яна да яго ніколі не была, надаў ёй адзнакі і рысы вядучага жанру сучаснай беларускай лірыкі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Андраюк, С. А. Традыцыі і сучаснасць / С. А. Андраюк. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 254 с. і

2. Куляшоў, А. Выбраныя творы : у 2 т. / А. Куляшоў. – Мінск : Маст. літ., 1967. – Т. 2. – 107 с.
3. Куляшоў, А. Збор твораў : у 5 т. / А. Куляшоў. – Мінск : Маст. літ., 1974–1977. – Т. 5. – 511 с.

**А. С. Кавалюк**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

## ЖАНРАВАЕ І ПРАБЛЕМНА-ТЭМАТЫЧНАЕ ПОЛЕ АПАВЯДАННЯЎ МОЛАДЗЕВАЙ ТЭМАТЫКІ БЕРАСЦЕЙСКІХ АЎТАРАЎ

Жанравае і праблемна-тэматычнае поле апавяданняў моладзевай тэматыкі празаікаў Берасцейшчыны выяўлялася і асэнсоўвалася на матэрыяле кніг “Вяртанне берасцейскай стралы” Л. Валасюка (Брэст, 2012), “Дазволь прычасціцца: духоўная паэзія і проза берасцейцаў” (Брэст, 2011), “Дым з коміна” (Мінск, 2011) і “Чысты чацвер” (Брэст, 2015) А. Зайкі, “Палескі Напалеон” (Мінск, 2011), “Параненыя мары” (Брэст, 2002), “Хуліган” (Мінск, 2017) А. Крэйдзіча, “Кнігаўка” В. Куксы (Мінск, 2005), “Цвіў белы-белы бэз” В. Супрунчука (Мінск, 2013), “Незваротны шлях” М. Сянкевіча (Брэст, 2012), “Жывому – жыць (Споведзь качагара)” (Мінск, 2013), “Страла жыцця” (Брэст, 2007) А. Філатава.

Знаёмства з творамі названых аўтараў выявіла жанравую разнастайнасць прозы літаратараў Берасцейшчыны. Кнігу “Вяртанне берасцейскай стралы” Л. Валасюка склалі раманы, аповесці, апавяданні, абразкі; кнігі “Дым з коміна” і “Чысты чацвер” А. Зайкі – лірычныя запісы, мініяцюры, апавяданні; кнігу “Палескі Напалеон” А. Крэйдзіча – аповесць і апавяданні; “Параненыя мары” А. Крэйдзіча – п’еса, апавяданні, мініяцюры; “Хуліган” А. Крэйдзіча – аповесці, апавяданні, нататкі, мініяцюры; кнігі “Кнігаўка” В. Куксы і “Цвіў белы-белы бэз” В. Супрунчука – аповесць, апавяданні; “Страла жыцця” А. Філатава – мініяцюры, апавяданні, народны гумар, аповесці, вершы. Такім чынам, многія з берасцейскіх празаікаў распрацоўвалі т. зв. малыя жанравыя формы.

Да жанру апавядання ў сваёй творчасці звярталіся А. Наварыч, А. Крэйдзіч, М. Сянкевіч, А. Зайка, Л. Валасюк, В. Кукса і інш. Праблемна-тэматычны дыяпазон берасцейскай прозы даволі шырокі: ад традыцыйнай для нацыянальнай літаратуры вясковай тэматыкі, супрацьпастаўлення гарадскога і вясковага свету і светаўспрымання людзей да выяўлення маральнай дэградацыі і духоўнага жабрацтва сучаснікаў. Вясковая тэма шматаспектна ўвасоблена ў апавяданнях “Дзед Сашко”, “У Парагвай, у цёплы край...” В. Супрунчука, “Мухамор” А. Крэйдзіча, “Чысты чацвер” В. Коўтун, “Салавей”, “Хроніка трох дзён” А. Зайкі, “Жанчыны” М. Сянкевіча, інш. Пісьменніцкі погляд часта засяроджваецца на адной з балючых праблем сучаснасці – праблеме п’янства і маральнай дэградацыі чалавека. Яна асэнсоўваецца ў апавяданнях “Журавіны”